*Гоўзіч І.М.*
***БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. XI КЛАС***



# ТЭМА 2. ІВАН ПЯТРОВІЧ ШАМЯКІН

1. Стварыце віртуальны музей (ці сайт), прысвечаны творчасці Івана Шамякіна.

2. Растлумачце сэнс назвы аповесці «Непаўторная вясна». (Выкажыце ўласны пункт погляду). **Прапануйце ўласныя назвы твора І. Шамякіна**. Свой пункт гледжання абгрунтуйце цытатамі ці пераказам адпаведных урыўкаў твора.

3. У які час быў напісаны раман «Сэрца на далоні»? Працытуйце радкі беларускіх ці рускіх паэтаў пра гэтую цікавую эпоху. Чым, якімі рысамі канец 1950-х — 1960-я гады блізкія нашым гадам?

| **Канец 1950-х — 1960-я гады** | **Тэзіс (агульнае)** | **Сучаснасць** |
|---|---|---|
| | | |

4. Падрыхтуйце **выказванне** па тэмах «Непаўторны свет непаўторных пачуццяў», «Шляхі-дарогі Пеці і Сашы да шчасця».

5. Паразважайце над **тэзісам**: «Работа – не воўк, у лес не ўцячэ. Напрацуюся яшчэ». Ці можа быць па-сапраўднаму шчаслівай Люба?

6. Напішыце **міні-сачыненне** «Быць шчаслівым – ...».У працэсе напісання сачынення выкарыстайце вершы Максіма Танка.

7. **Правядзіце інтэрв'ю з** сябрамі, знаёмымі, родзічамі, запоўніўшы табліцу:

| Удзельнікі | Як Вы разумееце, што такое шчасце? | Якога чалавека можна назваць шчаслівым? |
|---|---|---|
| 1. Мама, 35 год | | |

8. Напішыце **сачыненне** на адну з прапанаваных тэм: «Дзве жыццёвыя пазіцыі ў рамане І.П. Шамякіна «Сэрца на далоні» (Яраш і Шыковіч — Гукан)»; «Маладое пакаленне ў рамане І.П. Шамякіна»; «Стыль шамякінскіх раманаў і аповесцей».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

9. Напішыце **сцэнарый** тэлевізійнага роліка па творы Івана Шамякіна «Гандлярка і паэт» для жыхароў Еўропы, які б выклікаў жаданне паглядзець фільм па творы.

10. **Дапамажыце кветцы аднавіць пялёсткі, у якіх пазначаюцца назвы твораў Івана Шамякіна:**




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ